РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вольга Вярбіцкая*

## УВАСАБЛЕННЕ ФАЛЬКЛОРУ Ў ТВОРЧАЙ СПАДЧЫНЕ ЯКУБА КОЛАСА

Сучаснае беларускае грамадства знаходзіцца на этапе выпрацоўкі новых каштоўнасных арыентацый і метадалагічных падыходаў да асэнсавання рэальнасці. У сувязі з гэтым у айчыннай культуралогіі ўзнікае патрэба звяртання да вытокаў і перадумоў, якія забяспечваюць працэсы пераемнасці ў духоўным развіцці нацыі, нягледзячы на дынамізм і інавацыйнасць сённяшніх перамен. Пазітыўная, выверанная часам творчая традыцыя ўтрымліваецца ў літаратурнай спадчыне класіка беларускай літаратуры Якуба Коласа. Творчая дамінанта яго твораў мае тую сілу, што працуе ў межах вялікага гістарычнага часу і поліфанічна, шматгалосна звязана з мінулым, сучаснасцю і будычыней. Глыбокаму веданню каранёў народнай культуры Якубам Коласам спрыялі ўмовы яго жыцця ў сялянскім асяроддзі. Паэт успамінае: «У нас часта начавалі розныя людзі, пераважна сяляне. Цэлымі вечарамі я слухаў іх апавяданні, у якіх раскрываўся для мяне цэлы свет разуменняў і ўяўленняў» [1, с. 142]. Не меншае ўражанне засталося ад легенд, паданняў, казак, прымавак, трапных выразаў, пачутых ад дзядзькі Антося, бацькі, песен маці і іншых сваякоў. «Ні матыву, ні слоў успамянуць не магу, але яны недзе жывуць ва мне, і калі пачынаю ўяўляць нашу хату, маці пры рабоце, – здаецца, чую і песню» [14, с. 5].

Уваходжанне Коласа ў этнічную культуру беларусаў працягваўся і ў юнацкія гады. У Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа захоўваюцца дзесяць сшыткаў з фальклорнымі запісамі, зробленнымі ў час вучобы ў Нясвіжскай семінарыі і ў гады працы ў вёсках Палесся.

Ён надаваў выключнае значэнне фальклору, успрымаў яго як важную і неад'емную частку духоўнай культуры народа. У вуснай народнай творчасці адлюстроўваюцца гісторыя і працоўны вопыт, грамадска-палітычныя і эстэтычныя ідэалы, мары і спадзяванні простага люду. Пры стварэнні такіх сваіх літаратурных твораў, як апавяданне «Калядны вечар» [5], паэмы «Новая зямля, «Сымон-музыка», трылогія «На ростанях» і іншых ён шырока карыстаўся вуснапаэтычнай спадчынай беларусаў, запазычваў з іх сюжэты і вобразы, пераасэнсоўваў іх, напаўняў зусім іншым, новым гучаннем, у многім нетрадыцыйным. У фальклоры так ці інакш адлюстроўваюцца рэальныя з'явы, раскрываецца не толькі жыццё і быт народа, вуснапаэтычныя творы паказваюць асаблівасці культуры, сацыяльнага ладу, пэўнага перыяду фарміравання беларусаў, як самабытнай нацыі. Шырокае ўвядзенне ў свае творы фальклорных сюжэтаў Я. Колас тлумачыў тым, што далучэнне да культуры адбываецца, перш за ўсё, праз фальклор, які з'яўляецца адным з сродкаў выяўлення ўнутранага свету беларускага народа.

Аналіз шэрагу літаратурных твораў Я. Коласа сведчыць: народны паэт Беларусі апрацоўваў казкі, паданнні, песні, гісторыі і ўключаў іх у свае паэмы, апавяданні, раманы. Ужо ў ранніх яго творах Колас для адлюстравання шырокай панарамы жыцця беларусаў і ўвасаблення нацыянальнага каларыту Колас удала скарыстоўвае багацце беларускай народнай песні. Так, да народнай песні як мастацкага сродку, для раскрыцця ідэі твора пісьменнік звяртаўся ў апавяданнях «Соцкі падвёў» [4], «Сацыяліст» [6]. Ролю песні ў жыцці народа дакладна адлюстраваў Я. Колас у паэме «Новая зямля» [13]. У гэтым творы аўтар пакакзвае, што песня павінна быць побач з чалавекам, усюды суправаджаць яго, тады і жыць будзе лягчэй. Героі паэмы спяваюць песні падчас сенакосу, жніва, рэлігійных і сямейных свят. Беларуская народная песня дапамагала паэту захаваць і данесці да чытача непаўторны нацыянальны каларыт, падкрэсліць адметнасці светапогляду беларусаў, асаблівасці іх побыту.

Якуб Колас не проста схематычна запазычваў вуснапаэтычныя творы з нацыянальнай духоўнай скарбонкі, а рабіў гэта мэтанакіравана, спрабуючы адшукаць у легендах, паданнях, прыказках нейкае рацыянальнае зерне, дзякуючы якому яны захаваліся на працягу стагоддзяў. Насычана легендамі трылогія «На ростанях» [12]. У ёй Колас па-свойму пераказвае біблейскую легенду аб стварэнні Сусвету і ўсяго жывога ў ім. На старонках трылогіі расказваецца легенда аб з'яўленні на Палессі прыгажунь-дзяўчат. Прысутнічаюць у згаданым творы і гістарычныя легенды. Напрыклад, па-майстэрску перададзены аповеды пра Яшукову гару і Шведскае Паленне. Адлюстраванне гістарычных паданняў маецца ў паэме «Сымон-музыка». Якуб Колас увёў у паэму вобраз Старца ў белым адзенні: «Азірнуўся – зноў магілы / I пахілыя крыжы, / А на прыкладзе драўляным / Бачыць сівенькі дзядок, Дзед Курыла, у бель убраны, / Галаву схіліў набок... » [10].

Вобраз Старца запазычаны з шырока вядомай на Віцебшчыне легенды пра курган-магілу Галубец, з якой уначы выходзіць Старац, але, калі наблізіцца да яго хто на пару крокаў, ён адразу знікае.

Доўгімі зімовымі вечарамі ў лесніковай хаце Міхал, Антось і Ганна расказваюць шматлікія легенды, якія яны ў сваю чаргу пачулі ад сваіх бацькоў: «Пачнуць казаць свае ўспамінкі, Вясці размовы пра старынкі, / Пра незвычайныя здарэнні / I ім даваць тут тлумачэнні...» [13, с. 170].

Даследаванне творчай спадчыны Я. Коласа дае нам падставу сцвярджаць, што яго мысленне было міфа-паэтычным, заснаваным на глыбокім разуменні міфалогіі беларусаў. Сведчаннем сказанага з'ўляецца кніга алегарычных апавяданняў Коласа «Казкі жыцця» [7], паэмы «Новая зямля», «Сымон-музыка», трылогія «На ростанях», навела «Балотны агонь»[8] і інш. Вобразная сістэма азначаных твораў уключана ў адпаведнае семантычнае поле прасторы, для якога характэрна здзіўляючае адзінства зямлі і неба, узаемасувязь усіх кампанентаў, з'яў вялікай прыроды і еднасць іх з Космасам. У Я. Коласа беларускім Космасам з'яўляецца ландшафт: лес, луг, балота, курган, пагорак, поле, рэчка, крыніца. Паэт шукае ўнутраную еднасць свету і звяртаецца да міфалагічных структур. Так, у навеле «Балотны агонь» беларускі космас прадстаўлены як міфалагічная мадэль свету з востравам пасярод акіяну. Акіянам уяўляецца балота, а Прадрэвам – дуб, які ёсць вось свету на ім. «Балота, на якім прыгожа раскінуўся астравок ... здавалася, не мела канца-краю. Найстарэйшы між усіх тут дуб, стоячы на самым высокім месцы вострава, не бачыў канца балота»[8, с. 496]. У беларускім Космасе важнейшыя персанажы лес, вада, сонца, вецер, далі. Лес разумеўся Коласам як гарманізуючы пачатак у свеце, як вышэйшая Прыгажосць, як ідэя чалавечай згуртаванасці. Вобраз дрэва ў натурфіласофіі пісьменніка – мадэль цэласнасці зямной прыроды. Яно глыбока пускае карэнні ў зямлю, а галаву падстаўляе небу, сонцу.

У шэрагу коласаўскіх мастацкіх твораў пануе культ вады. Менавіта каля рэчкі, ручайка кіпіць у беларускім Космасе жыццё. Вада ў паэзіі і прозе Я.Коласа – сімвал вечнага руху наперад.

Міфалогія беларусаў – міфалогія сонечная, дзе ўшаноўваўся культ святла, неба і сонца. Паэт добра адчуваў гэтую асаблівасць беларускай міфалогіі, пагэтаму сонца прысутнічае амаль ў кожным яго творы. У кантэксце фальклорнай традыцыі сонца ў творах Я. Коласа паўстае як вобраз стралы, «залатой касы», «залатога абруса», «пышнага дывана», «залатой арфы», «чалавечай усмешкі». Па меркаванню паэта, сапраўднае прызначэнне сонца – сагравацьЗямлю, дарыць ёй жыццё. Ён верыць, што кожная істота жыве, беручы энергію ад двух вытокаў: ад усмешкі Сонца і ад дыхання Зямлі: «Тым часам сонца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выйшла ўгору / І з безгранічнага прастору / Шырокай плынню агнявою / На зямлю шчодраю рукою / Л'е блеск гарачы і яскравы...» [13, с. 242].

Аналіз творчасці Я. Коласа дае падставу сцвярджаць, што ў мэтах мастацкага ўзбагачэння шэрагу сваіх твораў ён актыўна ўводзіў этнаграфічна-бытавы кантэкст. Падключэнне этнаграфічнага фону ў Коласа залежыла ад абранай тэмы і жанру, тлумачылася яно таксама і імкненнем пісьменніка расказаць пра гістарычны час і паказаць самабытны характар беларуса. Этнаграфічныя інтарэсы народнага паэта праявіліся не толькі ў яго мастацкай творчасці. Якубам Коласам сабрана і апрацавана шмат этнаграфічных матэрыялаў падчас навучання ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі. Так, ужо ў 1900 г. ім была напісана і выдадзена літаратурна-этнаграфічная праца «Наша сяло, людзі і што робіцца ў сяле» [9]. Больш глыбокі характар мае этнаграфічная дзейнасць Коласа ў перыяд яго педагагічнай працы на Піншчыне (1902–1906 гг.). Аб сур'ёзнай зацікаўленнасці маладога паэта ў той час матэрыяльнай культурай беларусаў сведчыць яго этнаграфічная праца «Аб сялянскіх пабудовах (вёскі Люсіна, Мінскай губерні, Пінскага павета, Хатыніцкай воласці)» [11]. У ёй Я. Колас дасканала вывучыў сялянскае жыллё палешукоў. Кампазіцыйна праца пабудавана ў адпаведнасці з тагачаснай методыкай збірання і апісання этнаграфічных матэрыялаў. Спачатку характарызуецца геаграфічнае становішча вёскі, потым – духоўны і разумовы склад палешука, яго заняткі. Сялянскае жыллё разглядаецца вельмі дэталёва: планіроўка вёскі, сядзіба, хата, гаспадарчыя пабудовы, унутранае ўбранне хаты. Многія са змешчаных у гэтай працы этнаграфічных матэрыялаў Колас уключыць у аповесці «У палескай глушы», «У глыбі Палесся».

Вывучэнне творчасці Я. Коласа паказвае, што цікавасць да народнага быту не слабела ў пазнейшы час. Напрыклад, у творах, уключаных у «Другое чытанне для дзяцей беларусаў», шмат дэталей этнаграфічнага характару [2]. Этнаграфічны характар «Другога чытання», на наш погляд, абумоўлены імкненнем паэта пазнаёміць маладое пакаленне беларусаў з жыццём і бытам народа і тым самым абудзіць у ім любоў да сваёй краіны, да роднай мовы. Колас асноўную ўвагу звяртае на такі важны бок народнай культуры, як працоўная дзейнасць, вытворчы і матэрыяльны быт беларусаў. У творах для дзяцей знайшлі адлюстраванне таксама народныя звычаі, абрады, адзенне беларусаў.

Этнаграфічны характар маюць шматлікія артыкулы і карэспандэнцыі Якуба Коласа, надрукаваныя «Нашай нівай» у 1906–1907 гадах. Жывы этнаграфічны матэрыял адчуваецца ў допісах маладога літаратара «Сялянскія думкі» [3]. Знаёмства з этнаграфічнымі матэрыяламі дакастрычніцкага перыяду сведчыць, што цікавасць Коласа да матэрыяльнай культуры беларусаў з гадамі ўзмацнялася, рос прафесійны ўзровень яго прац.

Спіс літаратуры:

1. Камароўская, Л.В. Фальклорныя традыцыі ў апавяданнях Якуба Коласа дакастрычніцкага перыяду / Л.В. Камароўская // Каласавіны : навуковая канферэнцыя з нагоды 90-годдзя творчай дзейнасці Якуба Коласа (1996). – Мінск : Дзярж. літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа, 1997. – С. 35–43.
2. Колас, Я. Другое чытанне для дзяцей беларусаў / Я. Колас. – Пецярбург, 1910. – 271 с.
3. Колас, Я. Сялянскія думкі / Я. Колас // Збор твораў : у 14 т. – Мінск : Маст. літ., 1972. – Т. 1. – С. 283.
4. Колас, Я. Соцкі падвёў / Я. Колас // Збор твораў : у 14 т. – Мінск : Маст. літ., 1973. – Т. 4.– С. 27–34.
5. Колас, Я. Калядны вечар / Я. Колас // Збор твораў : у 14 т. – Мінск : Маст.літ., 1973. – Т. 4.– С. 46–49.
6. Колас, Я. Сацыяліст / Я. Колас // Збор твораў : у 14 т. – Мінск : Маст. літ., 1973. – Т. 4.– С. 54–55.
7. Колас, Я. Казкі жыцця / Я. Колас // Збор твораў : у 14 т. – Мінск : Маст. літ., 1973. – Т. 5.– С. 469–590.
8. Колас, Я. Балотны агонь / Я. Колас // Збор твораў : у 14 т. – Мінск : Маст. літ., 1973. – Т. 5.– С. 495–496.
9. Колас, Я. Наша сяло, людзі і што робіцца ў сяле / Я. Колас // Збор твораў : у 14 т. – Мінск : Маст. літ., 1973. – Т. 4. – С. 258–314.
10. Колас, Я. Сымон-музыка / Я. Колас // Збор твораў : у 14 т. – Мінск : Маст. літ., 1974. – Т. 6. – С. 285–472.
11 Колас, Я. Аб сялянскіх пабудовах (вёскі Люсіна, Мінскай губерні, Пінскага павета, Хатыніцкай воласці) / Я. Колас // Рукапісны фонд Літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа, сшытак «Из белорусской жизни». – С. 105–114.
12. Колас, Я. На ростанях: Трылогія / Я. Колас. – Мінск : Дзярж. вучэб.-пед. выд-ва Мін-ва асветы БССР, 1958. – 697 с.
13. Колас, Я. Новая зямля: Паэма / агул. рэд., пасляcл., Я. Янушкевіча ; уклад. У. Гілеп, Я. Янушкевіч ; прад. М. Мушынскага ; пер. на рус. С. Гарадзецкага і інш. ; пер. на польск. Ч. Сэнюха ; камент. М. Мушынскага, Я. Янушкевіча ; маст. В. Шаранговіч / Я. Колас. – Мінск : БФК, 2002.– 904 с., 91 л. іл.
14. Лужанін, М. Выбраныя творы : у 2 т. / М. Лужанін. – Мінск, 1993.– Т. 2. – 353 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГУКИ